## ■ Тры пытанні да ўлады

# Ці з'явіцца ў Любані вуліца імя газеты «Звязда»?

**У Любаншчыны і «Звязды» шмат агульнага. Менавіта гэтыя жывапісныя мясціны натхнілі Янку Купалу на стварэнне паэмы «Над ракой Арэсай», якая ўпершыню была надрукавана ў нашай газеце. А як не ўспомніць пра легендарны востраў Зыслаў! Гэта непераможная тэрыторыя, дзе друкаваліся падчас вайны ў глыбокім тыле ворага «Звязда», «Чырвоная змена», «Кліч Радзімы». «Заўсёды ў час вялікіх і малых свят мы праводзім там свае акцыі, канцэрты, — расказвае начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Любанскага райвыканкама Васіль КАТКАВЕЦ. — Нашы музейшчыкі распрацавалі цікавы квэст «Пазыўныя «Зыслаў». Сёлета востраў добраўпарадкавалі, зрабілі вялікі партызанскі прывал, аднавілі партызанскую кухню. За межамі комплексу зроблена цікавая, самабытная база адпачынку».**


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

***— Васіль Сцяпанавіч, ці праўда, што ў Любані з'явіцца вуліца імя газеты «Звязда»?***

— Гэта добрая ідэя. Яна ў нас абмяркоўвалася, але пакуль статусае рашэнне па гэтым пытанні не прынята. Пераймяноўваць старыя вуліцы — гэта заўсёды праблематычна. Але зараз ідзе распрацоўка канцэпцыі развіцця горада, і ў перспектыве адна з нашых новых вуліц можа атрымаць такую назву.

***— Якім быў Год культуры для Любаншчыны? Што было зроблена для добраўпарадкавання раёна?***

— Год культуры супаў з юбілеем: Любані — 450 гадоў. Ён прайшоў творча і вельмі плённа. Любаншчына жыве і працуе пад дэвізам: «Правінцыя — то стан душы, там выжыве культура». Мы актыўна зберагаем свае народныя традыцыі. У раёне пабудаваны ўнікальныя школа мастацтваў і школа рамёстваў. Уласна, падобныя ўстановы стварающа, каб рыхтаваць творчую правінцыйную эліту. Таму натуральна, што там адбываліся многія падзеі.

Мы запрашалі да ўдзелу ў святочных урачыстасцях нашых землякоў — музыкантаў, акцёраў, спевакоў, у нас адбываліся шыкоўныя канцэрты. Сёлета мы адзначылі 95-годдзе цудоўнага пісьменніка — Івана Муравейкі і юбілей аднаго са старэйшын беларускай хлебаробнай нівы, Героя Сацыялістычнай Працы Кузьмы Шаплыкі, які 53 гады (!) быў старшынёй калгаса «Чырвоная змена» і зрабіў яго адной з лепшых гаспадарак Савецкага Саюза. Такім чынам у гэтым годзе мы спрабавалі паказаць Любаншчыну рознабаковую: традыцыйную, мастацкую, літаратурную, працавітую.

Каб сапраўды любім стала кожнае месца, не толькі горад, але і маленькая вёсачка, мы паспрабавалі навесці належны парадак на сваёй тэрыторыі. Гэтаму садзейнічаў вялікі праект «Жывёе мая вёска» сумесна з раённым Саветам дэпутатаў, калі ў кожным сельсавеце праводзіліся святы населеных пунктаў. У раёне нават уведзены так званы чысты чацвер, калі нашы арганізацыі, прадпрыемствы выходзяць на замацаваныя тэрыторыі і даводзяць іх да бляску.

У гэтым годзе ў сувязі з юбілеем горада мы рэканструявалі парк культуры і адпачынку. І сёння ў ім ёсць цудоўны амфітэатр, сцэна, зроблены дарожкі, асвятленне, фантан, стаяць спартыўныя трэнажоры. У рэчышчы Года культуры мы паспрабавалі паказаць у розных ракурсах маладзёжную культуру, гэта і клубы вясёлых і знаходлівых, інтэлектуальная гульня «Што? Дзе? Калі?», конкурс «аўта-лэдзі», квэсты па гісторыі Любаншчыны. Традыцыйным ужо стаў праект «Пятровіца», калі маладыя людзі вывучаюць фальклорныя традыцыі, танцуюць, спяваюць.

***— Можа, таму ў вашым раёне вельмі вялікі працэнт замацавання маладых спецыялістаў?***

— Так, мы імкнёмся зрабіць іх жыццё цікавым, насычаным. Але ў раёне прымаюцца захады для таго, каб стварыць належныя ўмовы. Напрыклад, у галіне медыцыны, робіцца ўсё магчымае, каб маладыя спецыялісты атрымалі калі не жыллё, дык пакоі ў інтэрнаце. У нас распачалася работа па будаўніцтве новага горна-абагачальнага камбіната, і кампанія «Слаўкалій» абяцала, што таксама будзе ўзведзены і дом для спецыялістаў Любаншчыны. Зразумела, з'явяцца новыя працоўныя месцы, прыйдзе кагорта моладзі. Значыць, трэба ствараць належныя сацыяльныя ўмовы, культурныя выгады і нейкую інфраструктуру. У нас, дарэчы, вельмі добрая спартыўная база, не кожны раён можа пахваліцца двума басейнамі. Зараз актывізаваліся прадстаўнікі сферы абслугоўвання, гандлю. І з кожным інвестарам ідуць прапрацоўкі, каб яны маглі больш актыўна ўключацца ў інфраструктуру раёна, каб спектр паслуг, асабліва культурнага кірунку, быў як мага больш шырокім. Напрыклад, чаму б не выходзіць з прапановамі накшталт стварэння не толькі гандлёвых цэнтраў, але і невялічкага кінатэатра з лічбавымі выгодамі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
*dziadziula@zviazda.by*

## ■ Шпацыр па Камароўцы

# Святочныя закупкі: чым упрыгожым стол?

**Да Новага года засталося зусім нічога, а значыць, самы час пачаць падрыхтоўку да яго святкавання. А куды лепш рушыць за мяснымі далікатэсамі і сакавітымі фруктамі, як не на Камароўку?**

На мясных радах найбольшым попытам карыстаецца свініна: лапатку без косці аддаюць па 7,50 рубля за кілаграм, трохі даражэй каштуе філейная выразка — 8 рублёў. Гандаль ідзе бойка, таму ўжо пасля абеду многія прадаўцы распрадаюць лішкі — для вялікага выбару варта выпраўляцца за пакупкамі раней. Больш сур'ёзных выдаткаў вымагае пакупка ялавічыны — лапатка будзе каштаваць 11 рублёў за кілаграм. Калі душа просіць на Новы год чагосьці больш экзатычнага, можна звярнуць увагу, скажам, на баранiну — за шыйную выразку прыйдзецца аддаць 9 рублёў.

Для аматараў дыетычнага мяса — трус, яго прадаюць па 13 рублёў за кіло. Запечаная індычка — хутчэй, страва для амерыканскага Дня падзякі, але калі ваша кулінарная фантазія дойдзе і да такога, то кашалёк апусцее на 12 рублёў за кілаграм. Больш сціплы варыянт — тушка качкі, усяго 5,50 рубля за кіло. Катлеты для святочнага стала можна зрабіць з ялавічнага фаршу — 6,30 рубля за кілаграм. Цялячая пячонка — універсальны інгрэдыент: можна дадаць у салату, можна прыгатаваць асобна «па-венецыянску» ці нават зрабіць з ёй пірог. У любым выпадку за кілаграм трэба аддаць 6,50 рубля.

Калі галоўныя стравы «пакаштаваны», час прыступаць да мясных нарэзак. Іх можна зрабіць з паляндвіцы («Каралінскай» за 22 рублі ці «Хатняй» за 24), балыка за 17, філея «Далікатэснага» па аналагічным кошце ці рулета «Фермерскага», што прадаюць па 15 рублёў за кіло. Не стане лішняй і каўбаса, можна спыніцца, напрыклад, на сервелаце «Венгерскім» — 12 рублёў. Традыцыйныя беларускія стравы — ялавічны язык і сальцісон — аддаюць за 23,50 і 9 рублёў адпаведна. Ну і які святочны стол без рыбы? Вэнджаная скумбрыя аблегчыць кашалёк на 14 рублёў за кілаграм, слабасалёны селядзец (чаму б не зрабіць яго «пад шубай»?) — на 6,50. Бутэрброды з ікрой — яшчэ адзін сімвал Новага года. 100 грамаў ласасёвай каштуюць 25 рублёў.

Шпацыруем далей — да прылаўкаў з фруктамі, садавінай і агароднінай. Мясцовыя «каралі» — мандарыны. Іх тут на любы густ: драбнейшыя і не самыя прыгожыя распрадаюць на акцыях па 1,40 рубля за кілаграм, сярэднія — ад 2 да 2,80, а кошт на самых вялікіх прыгажуноў даходзіць да 3,50. З іншых цытрусавых шмат апельсінаў (кошт ад 1,50 да 3,90 рубля за кілаграм), лімонаў (4,50 за кіло) і свіці (гібрыд памэла і грэйпфрута), якія аддаюць па 5,90 рубля за кілаграм. Упрыгожаннем любога навагодняга стала будзе ананас — такое задавальненне каштуе 3 рублі за кілаграм. На многіх прылаўках прадаюць ківі, кошт амаль усюды аднолькавы — 3,50 рубля. А вось бананаў няшмат, каштуюць яны пераважна ад 1,50 да 1,60 рубля. Калі хочацца канцэнтраванай экзотыкі — можна ўзяць авакада па рублю за штуку. Яшчэ адзін «навагодні» тавар — гранат, за кілаграм сакавітых пладоў просяць ад 3 да 4,50 рубля.

**Лічыльнік «Звязды»**

(кошт за кілаграм, калі не пазначана іншае)

**Сыр «Расійскі» — 11,40**
**Масла «Сялянскае» — 2,20 (200 г)**
**Яблык «Ананасны» — 1,70**
**Груша «Ксенія» — 3,20**
**Бульба «Скарб» — 0,50**
**Цыбуля «Рэпка» — 0,90**
**Баклажан — 6,50**
**Філе курынае — 6,60**
**Яйка курынае Д-1 — 1,70 (дзясятак)**
**Хлеб «Нарачанскі» — 1,95 (бохан)**

Для аматараў грыбоў — шампіньёны (драбнейшыя па 4,35, буйныя — па 5,55 рубля) ці вешанкі — 5,25 за кіло. Памідоры прадаюць у асноўным дарагія, замежныя: кошт на кілаграм іспанскай агародніны дасягае 4 рублёў. Гуркі будуць каштаваць сямейнаму бюджэту ад 2,50 за дробныя беларускія сарты да 5,95 рубля за вялікія «іншаземцаў». Салодкія перцы прадаюць у сярэднім па 3,50 рубля, але можна знайсці іх і за 2,80. За кіло белакачаннай капусты просяць 65 капеек, яе пекінская «сястра» будзе каштаваць 1,50 рубля, каляровая — да 4,50.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

## ДЗЕД МАРОЗ АДДАСЦЬ ЗАГАД

**Галоўнаму беларускаму Дзеду Марозу, які жыве ў Белавежскай пушчы, падпарадкоўваюцца пагранічныя нарады.**

Праўда, раз у год, перад святам. Святочны рытуал загаду прапусціць Новы год праз дзяржаўную мяжу без усялякіх перашкод стаў добрай традыцыяй і прыгожай дзеяй. Сёлета мерапрыемства адбудзецца 25 снежня ў адзінаццаць раніцы. Самы сапраўдны пагранічны нарад адной з пушчанскіх застаў атрымае загад ад гаспадара памесця ў навагоднюю ноч без перашкод прапусціць новы 2017 год з усходу на захад. Потым у рэзідэнцыі Дзеда Мароза адбудзецца вясёлае прадстаўленне з карагодамі, падарункамі, экскурсіямі па казачным царстве.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

## «ПРАФСАЮЗЫ — ДЗЕЦЯМ»

**Пад такой назвай у Магілёве пройдзе дабрачынная навагодняя ёлка, якая збярэ паўтысячы дзяцей, у тым ліку з малазабяспечаных сем'яў, дзіцячых устаноў адукацыі інтэрнатнага тыпу і сацыяльных прытулкаў.**

На яе арганізацыю і падарункі з прафсаюзнага бюджэту выдзелена звыш за 7,6 тысячы рублёў. Дзед Мароз са Снягуркай запросяць дзятву прыняць удзел у гульнявой праграме з карагодамі і зімовымі забавамі, а таксама паглядзець казачную пастаноўку «Па дарозе ў Новы год». Як расказалі ў абласным аб'яднанні прафсаюзаў, напярэдадні зімовых свят іх арганізацыйныя структуры акцыя дапамагаюць падшэфным установам. Дарэчы, акцыя «Прафсаюзы — дзецям» носіць круглагадовы характар. На працягу года абласное аб'яднанне прафсаюзаў, камітэты і саветы галіновых прафсаюзаў аказалі дапамогу ўстановам адукацыі інтэрнатнага тыпу больш чым на 45,5 тысячы рублёў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

## ■ Акцэнт на здароўе

# СПІРТАВАЯ НАСТОЙКА: ДЛЯ СЭРЦА ЦІ АД... ЖЫЦЦЯ?

**Той, хто дапіўся да сардэчных настоек або канцэнтрату для ванны, магчыма, ажыццяўляе павольны сыход з жыцця, або пралангіраваны суіцыд.**



Настойкі глогу, календулы, валяр'яны і мурашынага спірту прадаюць ужо толькі па адным флаконе ў адны рукі і выключна ў дзённы час. У начны час аптэкі прапануюць аналагі настоек у выглядзе таблетак ці мазяў, якія спірт не змяшчаюць. Пералічаныя прэпараты могуць прызначацца ўрачамі ў якасці таннага сродку для лячэння сардэчных захворванняў, аднак ні для каго не сакрэт, што людзі з алкагольнай залежнасцю набываюць якую-небудзь з настоек і... выпіваюць яе яшчэ да таго, як дойдуць дадому.

Цяпер, напэўна, калі замест двух флаконаў можна купіць усяго адзін, давядзецца крыху папатпаць ногі ад адной аптэкі да другой. Абмяжоўваць даступнасць вадкасцяў са спіртам важна і неабходна — гэта пацвярджае і практыка развітых краін. А нам з нашым узроўнем спажывання (звыш 9 л спірту на душу насельніцтва ў 2015 годзе) і колькасцю залежных (на наркалагічным уліку — каля 165 тысяч беларусаў менавіта з алкагольнай залежнасцю) прымаць падобныя меры трэба было яшчэ ўчора.

— Гэтыя спіртавыя настойкі могуць ужывацца не для нейкага фармакалагічнага эфекту, а для таго, каб дасягнуць стану алкагольнага ап'янення, — тлумачыць **намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай часці Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя Сяргей ОСІПЧЫК.** — Аб'ёмная колькасць спірту там 40—60 працэнтаў, або 40—60 градусаў. Мы знізіўм даступнасць гэтых настоек, якія разглядаюцца як алкагольны напой.

***— Уводзіць рэцэпты на іх водпуск не плануецца?***

— Такой інфармацыі пакуль няма.

***— Некаторыя СМІ звязваюць прыняцце гэтай меры з атручэннем спіртавой вадкасцю для ванны пад назвай «Боярышник» у Іркуцку...***

— Ёсць рэзананс у сувязі з гэтай падзеяй, аднак гэты выпадак не мае дачынення да этылавага спірту.

***— Ці можа алкагольная залежнасць развіцца ад ужывання настойкі глогу?***

— Калі ўжываць у рэкамендаванай дозе, то не. Наогул, гэта малаверагодна. Такія настойкі ўжываюць людзі, у якіх развілася алкагольная залежнасць, і цяпер ім важна не што выпіць, а каб выпіць хоць што-небудзь. Такім чынам, настойкі глогу або той жа календулы набываюцца ў якасці даступнага і таннага этылавага спірту. Другая катэгорыя, якая набывае такія лекі, — гэта пажылое насельніцтва з кардыялагічнымі праблемамі. Звычайна трэба накапаць усяго некалькі кропель у лыжку і запіваць вадой. Але дасягнуць таго ж расслабляючага эфекту можна і з дапамогай прэпаратаў, напрыклад, у таблецыраванай форме, ёсць яшчэ зёлкі, якія можна гатаваць як чай, калі вам гэта рэкамендаваў урач.

***— Можа быць, і некаторым алкаголікам на нейкім этапе развіцця залежнасці дастаткова ўсяго некалькіх кропель?***

— Так і ёсць. Гэта ў тых выпадках, калі, як мы кажам, зніжана талерантнасць, адчувальнасць да этылавага спірту.

***— Ці могуць абмежавальныя меры справакаваць злоўжыванне ўсяго, што ўтрымлівае спірт?***

— Разумны здаровы чалавек не будзе ўжываць падобнае. У Іркуцку трэба весці размову пра людзей з цяжкай алкагольнай залежнасцю, якія не ў стане кантраляваць свае дзеянні. Ёсць і яшчэ адзін нюанс у такіх сітуацыях. Той, хто імкнецца выпіваць усё, што заўгодна, каб толькі «выключыцца», такім чынам павольна сыходзіць з жыцця. Існуе нават тэрмін «пралангіраваны суіцыд», калі чалавек уваходзіць з запой, не жадае выходзіць з яго і адмаўляецца ад медыцынскай дапамогі. На фоне ўжывання вялікіх доз алкаголю можа быць і спыненне дыхання, і парушэнне сардэчна-сасудзістай дзейнасці. Дыягназ пры гібелі такіх людзей так і гучыць: алкагольнае атручэнне...

Дарэчы, па выніках судова-медыцынскай экспертызы і па даных Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь, з-за атручэння этылавым спіртам у краіне гіне каля 1,5 тысячы чалавек у год.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*